# На непакоранай зямлі

Вераломна напаўшы на нашу Радзіму, гітлераўскія вандалы хацелі заняволіць савецкі народ, зрабіць свабодалюбівых людзей сваімі паслухмянымі рабамі. Славуты «новы парадак», які так расхвальвалі акупанты, на справе азначаў шыбеніцы, масавыя расстрэлы, знішчэнне ні ў чым не вінаватых старых, жанчын, дзяцей.

Прыціхла і замерла жыццё ў нашых вёсках. Зімою 1943 года гітлераўцы пад выглядам барацьбы з партызанамі пачалі свае карныя экспедыцыі супраць насельніцтва Палесся. Былі поўнасцю спалены вёскі Морач, Яскавічы, Вялікі Лес, якія цяпер аб'яднаны ў калгас імя Леніна. Толькі на тэрыторыі нашага калгаса фашысты спалілі і забілі звыш 500 мірных людзей, пераважна дзяцей, жанчын, старых. Поўнасцю былі знішчаны калгасныя пабудовы, жылыя дамы, а жывёла і маёмасць забраны.

І хоць фашысцкім акупантам удалося спаліць нашы вёскі, яны засталіся бяссільнымі знішчыць свабодалюбівы дух патрыётаў, пахіснуць упэўненасць у немінуючым разгроме ворага, хуткім прыходзе Савецкай Арміі.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый на акупіраванай тэрыторыі дзейнічалі магутныя партызанскія атрады. У прыватнасці, на тэрыторыі Яскавіцкага сельсавета дзейнічаў партызанскі атрад імя Варашылава. У ім са зброяй у руках змагаліся з ворагам дзесяткі былых калгаснікаў. У тылу ворага дзейнічала Савецкая ўлада, старшынёй сельскага Савета працаваў Фа а Адамавіч Сцешыц, які захаваў і цяпер выкарыстоўвае даваенную круглую пячатку сельсавета. Падпольныя райкомы партыі, сельскія Саветы арганізоўвалі і шырылі полымя партызанскай барацьбы. Народныя мсціўцы нападалі на гарнізоны і чыгуначную дарогу ворага.

На сядзібе калгасніка Васіля Фёдаравіча Сцешыца, якому цяпер 70 год і яшчэ працуе ў калгасе, размяшчалася разведка партызанскага атрада імя Варашылава. Начальнікам разведкі ў той час быў я. Штодня мы атрымоўвалі ад сваіх сувязных дакладныя звесткі аб намерах камандавання нямецкіх гарнізонаў, паліцэйскіх участкаў, своечасова разгадвалі іх планы, каб затым накрывавыя планы, каб затым наносіць па ворагу трапныя ўдары.

Былыя партызаны цяпер самаадданa працуюць у нашай гаспадарцы. Так, Іван Варановіч узначальвае комплексную брыгаду, Уладзімір Галаваcты працуе ў жывёлагадоўлі. Добрымі і працалюбівымі людзьмі з'яўляюцца былыя народныя мсціўцы Мікалай і Лявон Круковічы. Другую паляводчую брыгаду, якая, дарэчы, з'яўляецца перадавой у калгасе, вось ужо на працягу раду год узначальвае былы баец мясцовай роты Адам Круковіч. Рукамі тых, хто мужна змагаўся з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны, не толькі адноўлены вёскі, узведзены грамадскія будынкі, але і зроблен вялікі крок па шляху да багацця і культуры.

Цяпер у Яскавічах ёсць сельсавет, васьмігадовая школа, фельчарскі пункт, прасторны клуб на 300 месц, новы магазін, лазня. На калгаснай сядзібе ўзвышаюцца шматлікія жывёлагадоўчыя будынкі. Новыя школы, клубы, дамы бачны ў вёсках Морач, Вялікі Лес.

Пастаянным бічом сялян Яскавіцкага сельсавета было малазямелле. Пры дапамозе магутнай тэхнікі, паўсядзённых клопатаў і намаганняў Савецкай улады за апошнія гады асушана і асвоена звыш 400 гектараў выдатных тарфянікаў, а ў 1964 годзе будзе асвоена яшчэ прыкладна столькі ж. Ва ўсіх дамах ёсць радыё, ярка гараць лямпачкі Ільіча. Я ўжо не гавару аб тым, што амаль у кожнай хаце ёсць швейныя машыны, веласіпеды, прыгожая мэбля. Многія калгаснікі набылі матацыклы.

Калгаснікі свята ўшаноўваюць памяць аб тых, хто не дажыў да светлага свята Перамогі. У цэнтры вёскі ўзвышаецца помнік-абеліск на магіле партызан, якія аддалі сваё жыццё ў імя вызвалення роднай зямлі. Сюды, да абеліска, калгаснікі і школьнікі прыносяць букеты жывых кветак. Аб слаўных змагарах за свабоду расказваюць у сваіх гутарках агітатары.

**У. ШОШЫН,**

**былы начальнік партызанскай разведкі, старшыня калгаса імя Леніна.**